# ШКОЛА — ГЭТА ЖЫЦЦЁ



З Валянцінай Міхайлаўнай Ерашовай *(на здымку)*, выпускніцай ВДУ імя П. М. Машэрава, настаўніцай фізікі лепельскай сярэдняй школы № 2, я пазнаёмілася, калі была вучаніцай.

Педагог працуе ў школе з 1980 года, з павагай і чуласцю ставіцца да вучняў, любіць і ведае свой прадмет, удзельнічае ў розных школьных мерапрыемствах, рыхтуе вучняў да алімпіяд і праводзіць адкрытыя ўрокі.

— Мне вельмі падабаецца мая прафесія, нават не ўяўляю сябе на іншым месцы. У нашай сям'і шмат настаўнікаў. Напрыклад, з чатырох сясцёр маёй мамы трое — педагогі, — дзеліцца Валянціна Ерашова.

Уважліва слухаю настаўніцу і не перастаю здзіўляцца: як шмат у ёй энергіі, цікавых задумак, шчырасці, як натхнёна яна расказвае пра фізіку, як успамінае, што ў дзяцінстве замест гульняў на вуліцы рашала задачы і сканворды.

— Школа для мяне — гэта не толькі месца працы, але і магчымасць развівацца, папаўняць свае веды. Школа — маё жыццё.

Цікаўлюся ў Валянціны Міхайлаўны ўспамінамі пра студэнцкія гады, вучобу ва ўніверсітэце. З усмешкай на твары настаўніца пачынае распавядаць:

— У мяне былі найцудоўнейшыя выкладчыкі, у меру строгія, але справядлівыя. Памятаю сесіі, асабліва летнія, калі на вуліцы цёпла, вятрыска павявае, а мы а палове сёмай на першым трамваі едзем ва ўніверсітэт (тады — педагагічны інстытут), каб паспець заняць месца і зайсці на экзамен у першай пяцёрцы.

Пытаюся ў настаўніцы, ці прыязджала яна ў сваю альма-матар пасля яе заканчэння.

— Шмат разоў, калі сустракаліся з аднакурснікамі ці калі прывозіла вучняў на алімпіяду. Знешне ўніверсітэт змяніўся, папрыгажэў... Сённяшнім жа студэнтам хачу пажадаць любіць сваю справу і паважаць педагогаў.

**Аліна КАРПЫЗІНА, студэнтка 2-га курса ФлФ.**